Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за чэрвень 2013 г.

Напярэдадні дзяржаўнага свята Дня Незалежнасці ў чытальнай зале ЦБ арганізавана выстава "Жыві, Беларусь, пад знакам міра і дабра", якая будзе дзейнічаць да 5 ліпеня. Выстава ў храналагічнай паслядоўнасці адлюстраўвае асноўныя этапы развіцця суверэннай Рэспублікі Беларусь з часу з'яўлення на гістарычнай арэне.

## Мерапрыемствы ў рамках раённай бібліяэстафеты "Чытаючыя вёскі"

**15 чэрвеня** У Дзівінскай дзіцячай бібліятэцы стартавала бібліяэстафета "Чытаючыя вёскі". У гэты дзень было праведзена свята чытацкіх здавальненняў "Мы хотим, чтоб наше лето было книгами согрето". У праграме: конкурсы, віктарыны, ўзнагароджванне лепшых чытачоў.

Дзівінская сельская
дзіцячая бібліятэка, 150 чал.

**23 чэрвеня** Бібліяэстафету "Чытаючыя вёскі" падтрымала Балоцкая СБ у рамках свята 500-годдзя вёскі Балоты. Бібліятэка ўшаноўвала сваіх чытачоў у сямі намінацыях дыпломамі і падарункамі. Жыццёвыя і чытацкія інтарэсы намінантаў былі прадстаўлены ў медыапрэзентацыі. Гісторыю ўзнікнення вёскі паведаміла паэтка, ураджэнка вёскі Балоты Ніна Дрык.

Балоцкая СБ, 250 чал.

**23 чэрвеня** У рамках бібліяэстафеты "Чытаючыя вёскі" прайшло свята духоўнай асветы "Духоўныя кнігі – кнігі аб галоўным". На мерапрыемстве перад прысутнымі выступіў настаяцель Свята-Лукінскай царквы іерэй Аляксандр з царкоўным хорам. За актыўнае чытанне духоўнай літаратуры карыстальнікі былі адзначаны падзячнымі пісьмамі і падарункамі.

Шамятоўская СБ, 200 чал.

**23чэрвеня** Бібліяэстафета "Чытаючыя вёскі" праведзена ў Мінянскай СБ ў рамках свята вёскі Мінянка "Малая родина – большая любовь". У праграме:
- ушанаванне самых актыўных чытачоў бібліятэкі;
- фотавыставы "Человек читающий", "Как молоды мы были";
- запіс новых чытачоў дзяўчынкамі-бібліятэкарамі ў імправізацыйнай бібліятэцы на стадыёне;
- бяспройгрышная латарэя;
- канцэртная і конкурсна-гульнёвая праграма.

Мінянская СБ стадыён вёскі,
180 чал.

Усе мерапрыемствы бібліяэстафеты адлюстраваны на сайце РЦБС па адрасу KRCLS.BY.

## Мерапрыемствы ў рамках конкурсу дзіцячага чытання «Лета і кніга»

**1 чэрвеня** Свята дзяцінства "Дзяцінства маё…" У праграме:
- гульні, конкурсы, латарэя;
- тэатралізаванае казачнае прадстаўленне;
- конкурс малюнкаў крэйдам на асфальце.

Магдалінская СБ,
пляцоўка каля бібліятэкі,

47 чал.

**22 чэрвеня** Бібліятэчны дворык “Кніга пад сонцам” арганізаваны для выхаванцаў школьнага лагера адпачынку. З імі праведзена віктарына па правілам паводзін дзяцей на дарогах і гульнёвая праграма.

Тэвельская СБ, 38 чал.

**22 чэрвеня** Кнігападарожжа “З табою кніга добрая ідзем мы па жыцці” прайшло ў школьным лагеры. У праграме:
- конкурсная праграма “Цветик-семицветик”;
- літаратурная віктарына “В гостях у литературных героев”.

Именинская СБ, 42 чал.

**22 чэрвеня** Літаратурная віктарына «Сонечныя кропелькі кніжнага лета» прайшла ў форме тэатралізаванай гульні з удзелам казачнай феі, яе памочніцы і пірата. Дзеці зрабілі падарожжа на гару Казак, у заліў Вершаў, плылі па рэчцы Прыгод і пабывалі ў полі Апавяданняў.

Лукская СБ, 37 чал.

## <u>Іншыя мерапрыемствы</u>

**12 – 13 чэрвеня** Акцыя “Мы выбираем чтение” праведзена Дзівінскай СБ на пляцоўцы перад бібліятэкай. Жыхары падыходзілі да імправізацыйнай бібліятэкі, дзе былі прадстаўлены:
- выставы па інтарэсам;
- рэкламныя выданні бібліятэкі;
- навінкі перыёдыкі.

Як вынік акцыі - 23 жыхары вёскі сталі чытачамі бібліятэкі.

Дзівінская СБ, 120 чал.

**14 чэрвеня** У цэнтральнай бібліятэцы адбыўся відэапрактыкум для сельскіх бібліятэкараў раёна “Мае прафесійныя знаходкі. Укараняю ў практыку работы…”, на якім бібліятэчныя супрацоўнікі дзяліліся сваімі напрацоўкамі, а таксама прадстаўлялі сайты, якія дапамагаюць ім ў рабоце.

Цэнтральная бібліятэка, 53 чал.

**16 чэрвеня** Урок-абмеркаванне “Жывем з прыродай – не рабі ёй шкоды”. Праведзена экскурсія у лес, дзе прайшоў конкурс па пляценню вяночкаў.

Шамятоўская СБ, 26 чал.

**16 чэрвеня** Гульнёвую праграму “Компьютерные забавы” правяла бібліятэкар Арэхаўскай бібліятэкі. Мерапрыемства прайшло ў форме спаборніцтва дзяцей з камп’ютарным вірусам, які знішчыў ўсе файлы. Перамаглі вірус каманды «Сильных» і «Активных».

Арэхаўская СБ, 29 чал.

**22 чэрвеня** Экалагічная гадзіна “У природы есть друзья: это мы – и ты, и я”.
Для выхаванцаў школьнага лагера адпачынку праведзена гульнёвая праграма па правілам паводзін у лесе, на рэчцы, у полі і г.д.

Буховічская СБ,31 чал.

Бібліятэкар АБМ Іванова І.
2-36-81